# Бежанства

Мая бабуля выхавалася на Волзе, у Саратаўскай губэрні. Сяло, у якім яна жыла некалькі гадоў разам са сваімі бацькамі, называлася Разбойшчына. Тут калісь была схованка славутага атамана Сьценькі Разіна. Расказы бабулі пра жыцьцё ў Разбойшчыне сталі часткай маёй памяці. Пэўна ж таму я так палюбіў песьню "Волга, Волга, мать родная" і доўга марыў, каб сплысьці па гэтай рацэ параходам.

У Разбойшчыну бабуля патрапіла ў час бежанства. Мала хто зь беларусаў, якія нарадзіліся на Беласточчыне да Першай усясьветнай вайны, ня быў у бежанстве. Тым ня менш маладое пакаленьне, нават ведаючы, што дзяды–прадзеды жылі некалькі гадоў у глыбі Расеі, ня ведае ўжо гэтага расейскага слова — бежанства.

Вельмі добра, што Музэй у Бельску–Падляскім (аддзяленьне Акруговага музэю ў Беластоку) арганізаваў сумесна зь Беларускім гістарычным таварыствам выставу "*Bieżeństwo. Nieznany exodus 1915—1921*"*.

Задума гэтай выставы (і яе зьдзяйсьненьне) належыць Дарафею Фіёніку, маладому, але ўжо вядомаму сваімі публікацыямі дасьледчыку нашае мінуўшчыны. Дарафей, студэнт другога курсу музэязнаўства ў Менску, раздабыў экспанаты ня толькі на бацькаўшчыне, але і ў беларускай сталіцы, перш за ўсё ў Літаратурным музэі Максіма Багдановіча (вялікі паэт дзейсна займаўся дапамогай бежанцам).

Цэнтральным пунктам і аздобай выставы зьяўляецца воз, пакрыты будай з палатна. На такіх вазах летам 1915 году нашыя продкі пакінулі свае родныя мясьціны і рушылі на ўсход.

Шматлікія фотаздымкі і дакумэнты паказваюць этапы бежанства: выбух Першай усясьветнай вайны, падпальваньне вёскі казакамі (расейцы, адступаючы перад немцамі, прымянялі тактыку "спаленай зямлі"), пакутніцкі шлях уцёкаў на ўсход, калі людзі мерлі ад голаду і эпідэміяў; расьсяленьне бежанцаў у Расеі, дапамогу з боку расейскіх (у тым ліку і беларускіх) дабрачынных установаў і арганізацыяў і, нарэшце, вяртаньне на бацькаўшчыну, дзе бежанцаў чакалі чарговыя пакуты на развалінах родных сяліб.

Колькасьць беларусаў, якія былі ў бежанстве, вагаецца паводле, розных зьвестак, ад паўтара мільёна да двух. Колькі было бежанцаў зь Беласточчыны — пакуль што ніхто не ўстанавіў. Вядома толькі, што амаль усе. У Бельску і ягоных ваколіцах засталося толькі каля ста праваслаўных сем'яў.

Усё важнае: нямецкая акупацыя і змаганьне за межы паміж Польшчай, Расеяй, Літвой, Украінай — адбылося практычна без удзелу тутэйшых беларусаў, якія тады знаходзіліся на Волзе, Доне і на рэках Сібіры.

Палова бежанцаў ніколі не вярнулася дадому. Такім чынам, бежанства зьмяніла этнічны склад насельніцтва Беласточчыны (палякі наагул у бежанства не падаліся). Як ні дзіўна, гэты факт па сёньняшні дзень ігнаруецца польскімі спэцыялістамі па гістарычнай дэмаграфіі. Крыху ў тым віны і беларускіх гісторыкаў. Няма ніводнай вялікай працы пра бежанства. У нашым асяродзьдзі толькі нядаўна зьявілася кніжка Ірыны Матус пра яе роднае сяло Давідовічы**, дзе вычарпальна гаворыцца пра бежанства на прыкладзе адной вёскі.

Мы паволі пачынаем разумець, што бежанства было самым вялікім выпрабаваньнем нашага грамадзтва ў XX стагодзьдзі, а можа і за некалькі стагодзьдзяў. Тут успомніў я размову з бацюшкам–лэмкам у бэскідзкай вёсцы Ляшчыны. Даведаўшыся, што я — беларус, бацюшка ўздыхнуў і сказаў: "О, вы, беларусы — народ ня рушаны". Быў у гэтым сказе тон зайздрасьці. Чалавек, якога выгналі з роднае хаты, мае права зайздросьціць чалавеку, які сядзіць на сваёй зямлі. Толькі што гэта не зусім так: мы ж былі ў бежанстве.

*Друкуецца паводле:* Ніва. 1995. 24 сьнежня. № 52. С. 1, 5.

---

* "Бежанства — невядомы зыход 1915—1921". — **Рэд.**

** Маецца на ўвазе наступнае выданьне: Matus I. Wieś Strzelce–Dawidowicze w tradycji historycznej. Białystok, 1994. — **Рэд.**